*стагі*, адзначаюць лепшыя адказы. Настаўнік можа прапанаваць вучням скласці дома апавяданне «Мой край» з выкарыстаннем падабраных параўнанняў, кожнае з якіх толькі ў тым выпадку будзе ўяўляць каштоўнасць, калі яно народзіцца ў вучня з патрэбнасці выразіць, перадаць яркую карціну.

Пачатковая школа не ставіць перад сабой мэты даць вучням тэарэтычныя звесткі пра сродкі выразнасці мовы. Уся праца носіць практычны характар і падпарадкоўваецца сістэме развіцця маўлення. Асноўнымі прыёмамі працы з'яўляюцца наступныя: знаходжанне ў тэксце вобразных слоў і выразаў; тлумачэнне іх значэння; практыкаванні ў падборы метафар, параўнанняў, эпітэтаў; слоўнае маляванне, узнаўленне вобраза па апісанні ў тэксце; уключэнне вобразных сродкаў у пераказы, сачыненні.

Такім чынам, сістэматычная і мэтанакіраваная праца над тропамі дапамагае настаўніку фарміраваць вобразнае маўленне вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Літаратура:**

1. Старычонак, В. Д. Беларуская мова : шк. слоўнік-даведнік / В. Д. Старычонак. – Мінск, 2002. – 367 с.
2. Телия, В. Н. Метафоризация и ее роль в создании языковой картины мира / В. Н. Телия // Роль человеческого фактора в языке. Язык и картина мира. – М. : Наука, 1988. – С. 183–204.

## НЕЎМІРУЧЫ ВОБРАЗ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ

**Лукшына Ю.В.,**
студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Прыгажосць штодзень побач з намі. Але ў кожнага чалавека сваё разуменне прыгожага. Кожны з нас не аднойчы быў зачараваны ёю.

А што такое прыгажосць? Гэта, напэўна, тое, што вабіць, радуе душу, цешыць вока.

Жыццёвая прыгажосць знаходзіць адлюстраванне ў літаратуры. А. П. Чэхаў пісаў: *"У чалавека павінна быць усё прыгожым: і твар, і адзенне, і душа, і думкі"*.

Уяўленні аб прыгажосці жанчыны ў розныя гістарычныя эпохі былі рознымі.

Бандароўна прыгожая, і прыгажосць яе рамантычная, амаль казачная, незвычайная. Можа, гераіня незямная? Для чаго аўтар паэтызуе выгляд гераіні? Як ствараў Янка Купала гэты вобраз, як сам адносіўся да сваёй гераіні і якія пачуцці выклікаў у нас?

Бандароўна – дачка казака Бандарэнкі з мястэчка Берастэчка, натура ўзвышаная, вытанчаная. Прыгажосцю дзяўчыны захапляецца сам паэт:

*Хараства такога ў свеце*
*Не было, не будзе;*
*Аб ёй людзі гаварылі,*
*Як аб нейкім цудзе.*

Гэта пра яе, Бандароўну. З мэтай больш яскрава паказаць прыгажосць Бандароўны Янка Купала шырока карыстаецца народна-паэтычнымі эпітэтамі, параўнаннямі і зваротамі. Паэт надзяляе сваю гераіню такімі рысамі знешнасці, якія ўласцівы самым ідэальным героям народных песень і казак. Бандароўна стройная, высокая, "уся, як цень, павеўна". Гэта яе губкі параўноўвае ён з малінай, твар – з лілеяй, косы – з іскрыстасцю брыльянцістых рос, вочы – з зоркамі, ад якіх яснее свет. Сваёй чароўнай прыгажосцю Бандароўна "задзіўляе ўсіх чыста, як зара якая". Янка Купала лічыць, што вонкавы выгляд – ключ да душы, а чалавека працы жыццё часцей "чысціць", значыць, і душой ён чысцейшы, багацейшы.

Такія ж прыгожыя і ўчынкі дзяўчыны, яе духоўны свет. Са знешняй прыгажосцю гармануе яе ўнутранае хараство. Яна – чалавек палымянай душы, гордая, смелая, валявая, мужная, бескампрамісная. А якая непакорлівасць, якое свабодалюбства! Як гэтага не хапае цяпер нам, беларусам.

Бандароўна – чалавек непадкупнага сумлення. З пагардай адмаўляецца ад багацця і грошай Патоцкага. Для гэтай гордай і свабодалюбівай дзяўчыны самае святое – дзявочы гонар і слава, чалавечая годнасць, унутраная незалежнасць. Яна больш за ўсё цэніць свабоду і ніколі не стане жыць у няволі. Гэту свабоду яна прадаць не можа.

Свабодны чалавек, на думку Купалы, ужо не згодны будзе трапіць пад уціск іншага. Бандароўна кідае выклік самому пану Патоцкаму. І калі вырашаецца яе лёс, яна не можа здрадзіць сабе. Гераіня вырашае лепш загінуць, чым паступіцца сваім сумленнем.

Гегель лічыў, што свабода чалавека правяраецца ў сітуацыі, найбольшай для яго небяспекі. У такой сітуацыі і апынулася дзяўчына. Купала імкнецца паказаць не складанасць і вытанчанасць сваёй гераіні, а перш за ўсё права на жыццё і свабоду, чалавечую годнасць, духоўную моц, права на абарону сваёй дзявоцкасці. Смеласці, мужнасці дзяўчыны можна пазайздросціць:

Хто яна – Бандароўна – ахвяра ці пераможца? Думаецца, і тое і другое адначасова. Гераіня ахвяруе сваім жыццём у імя свабоды і абароны чалавечых правоў. Бандароўна перамагае духоўна, застаецца вернай маралі бацькоў, сцвярджае свабодалюбства як першаснову сваёй сутнасці.

*Перад панам тым з Канева*
*Смела дзеўка стала,*
*Смела гледзячы ў вочы,*
*Смела адказала…*

Адкуль такая сіла, моц Бандароўны? Гераіня сама адказвае так:

– *Дужы ты з сваім багаццем,*
*А я сілы большай, –*

Репозиторий ГрГМУ

*За мной праўда і народ мой,*
*За табой жа – грошы!*

Так, народ са сваімі традыцыямі, сваімі ўяўленнямі аб прыгажосці выхаваў, выпеставаў не адну такую дзяўчыну. Народ любіць сваю гераіню, яна – яго крывінка, яго дачка. *“Уцякай жа за пагодай, донька маладая”*, – вучаць дзяўчыну старэйшыя.

Асаблівыя адносіны да Бандароўны ў аўтара. Паэт любуецца, захапляецца дзяўчынай, спачувае ёй. Аб гэтым гавораць не толькі прамыя звароты да “*галубкі*” (так пяшчотна называе яе Я. Купала), але і кожны радок паэмы. Аўтар не проста апісвае знешні выгляд, паводзіны Бандароўны, ён зачараваны ёю. І таму паэт можа казаць толькі так: губкі, ручкі, галоўка, вочкі. Многія эпітэты, параўнанні, словы-сімвалы запазычаны з вуснай народнай творчасці нездарма. Ніхто не можа лепш ацаніць вартасці чалавека, чым народ. Таму ў паэме жыве і вецер крылаты, і бярозка бела, і рута-мята, і тры таполі. Усё тут працуе на вобраз Бандароўны, нават вобраз пана Патоцкага. З асаблівай стараннасцю малюе Я. Купала разбэшчанасць, пагардлівасць да людзей пана з Канева, лютасць яго. Ён “*ні старому, ні малому не спускае жартаў*”. Гэты бязлітасны прыгнятальнік – увасабленне сіл тыраніі, жорсткасці, агіднасці і амаральнасці. Пад яго прыгнётам “*стогне змучана Ўкраіна, к небу шле праклярце*”. І чым цямнейшыя фарбы выбірае аўтар для стварэння гэтага вобраза, тым вышэй узнімаецца над ім Бандароўна. Сапраўды, прыгажосць асабліва яскрава вылучаецца на фоне пачварнага.

Яе смерць стала той апошняй кропляй, што перапоўніла чашу народнага цярпення. І народ уздымаецца на помсту за сваю гераіню, якая “*налажыла... за ўсіх галавою*”. Хаваючы Бандароўну, людзі прыбралі яе, як да шлюбу, у бель і вэлюм, звілі вяночкі з руты-мяты. Белы колер, кветкі руты-мяты – сімвал чысціні дзявочай. Як бачым, не толькі перад мужнасцю, але і перад гэтай чысцінёй схіліліся галовы людскія.

Смерць Бандароўны – гэта яшчэ і “ўрок мужнасці і гераізму, смелы выклік беззаконію, дэспатызму, сацыяльнай несправядлівасці” (В. Івашын).

Сваёй мужнасцю, рашучасцю і самаахвярнасцю Бандароўна падобная на Гусляра з паэмы “Курган”, які таксама не прадаў за князевы дукаты сваю песню, выступіў абаронцам свайго народа, даў прыклад духоўнай цэласнасці, унутранай незалежнасці і вальналюбства.

Беларуская літаратура надзвычай багатая на непаўторныя, самабытныя, прыгожыя жаночыя вобразы.

Я палюбіла Бандароўну… Палюбіла з той самай першай хвіліны, як толькі сустрэлася з ёй на ўроку беларускай літаратуры. Чаму? Таму што заўсёды ёсць людзі, якія са свайго часу выносяць і нясуць далей самае добрае, што заўжды было, ёсць або толькі зараджаецца ў глыбінях народнага жыцця. Таму што гэта гераіня выклікае гонар за людзей, якія высока нясуць званне Чалавека, і для многіх пакаленняў была, ёсць і будзе ўвасабленнем характва, нескаронасці, непадкупнага сумлення, узорам душэўнай чысціні і вернасці



Репозиторий ГрГМУ

народным маральным каштоўнасцям, высокай чалавечай годнасці. Вобраз Бандароўны прымусіў задумацца над адносінамі да гонару ў нашы дні.

Мы, людзі XXI стагоддзя, можам павучыцца ў гераіні Янкі Купалы адзінству ўнутранага і знешняга хараства, маральнай чысціні, непадкупнасці, высокай чалавечай годнасці, гэта прыклад нескаронасці духу.

**Літаратура:**

1. Навуменка, І. Янка Купала: духоўны воблік героя / І. Навуменка. – Мінск, 1980. – С. 86–88

2. Драўніцкі, І. Вобраз Бандароўны ў паэме Янкі Купалы і яго інтэрпрытацыя ў іншых відах мастацтва / І. Драўніцкі // Роднае слова. – 1995. – № 7. – С. 94–102.

3. Грыцаль, І. Прыгажосць вонкавая і ўнутраная. Урок-разважанне ў VIII класе паводле паэмы Янкі Купалы "Бандароўна" / І. Грыцаль // Роднае слова. – 2006. – № 1. – С. 48–49.

4. Лапіцкая, Т. Паэма Янкі Купалы "Бандароўна" / Т. Лапіцкая // Беларуская мова і літаратура. – 2010. – № 1. – С. 46–48.

5. Янка Купала: Жыццё і творчасць. Альбом выстаўка ў школе / Склад. І. С. Курбека. – 2-е выд., дап. – Мінск, 1983.

## МІЖМОЎНАЯ АМАНІМІЯ: ЛІНГВІСТЫЧНЫЯ ПАРАДОКСЫ

**Нікіценка С.С.,**
студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

У сувязі з развіццём сродкаў зносін і рэзкім павелічэннем маштаба зносін, глабалізацыі камунікацыі ў сучасным свеце ўзнікла праблема міжмоўнай аманіміі. Кожны дзень чалавек сутыкаецца з мноствам замежных моў – на таварах, у моўных запазычаннях, міжасобасных кантактах. Гэта не можа не прывесці да змены адносін да мовы як сродку зносін. Адбываецца змешванне і зрушэнне значэнняў у моўнай практыцы.

Беларуская мова налічвае тысячы слоў. Але асаблівую цікавасць выклікаюць словы, якія складаюцца з адных і тых жа гукаў, аднолькава вымаўляюцца і пішуцца, а значэнне маюць рознае, часта нават кантраснае.

Словы, якія аднолькава гучаць і маюць кантраснае значэнне, здольны доказна і аргументавана паказаць як блізкае, падобнае, так і адметнае ў мовах народаў. З'ява аманіміі назіраецца як у межах адной мовы, так і ў розных мовах.

Назіранне сітуацыі з кантраснай лексікай абумовіла пытанне: "Што такое міжмоўная аманімія?"

Мэта даследавання – знайсці і прааналізаваць міжмоўныя амонімы, супаставіць (параўнаць) іх лексічнае значэнне, сістэматызаваць аманімічныя пары.



Репозиторий ГрГМУ